кага Княства Літоўскага», дзе абгрунтаваў неабходнасць гэтага новага збору законаў і сфармуляваў канцэпцыю прававой дзяржавы: «Обачывали то усих веков люди мудрые, же в кождой речы посполитой чоловеку почстивому ничого не маеть быти дорожшого над вольность» – менавіта такімі словамі пачынаецца «Зварот Льва Сапегі да ўсіх саслоўяў Вялікага Княства Літоўскага». Абараняючы сваю свабоду, людзі не шкадавалі не толькі маёмасці, але і ўласнага жыцця. На думку Л. Сапегі, сутнасць свабоды складаюць неадчужальныя правы чалавека – права ўласнасці і права асабістай недатыкальнасці. Права Л. Сапега разглядаў не як прадукт боскага адкрыцця, а як сапраўднае праяўленне розуму чалавека, «вартавога ўсеагульнай свабоды». «Галоўнай мэтай законаў ва ўсім свеце, – адзначаў Л. Сапега, – з'яўляецца падтрыманне ў грамадстве такога становішча, каб кожны мог захоўваць у непарушнасці добрае імя, здароўе і маёмасць і не цярпець з боку іншых ніякай шкоды». Права павінна забяспечыць дзяржаве ўнутраны парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё, сацыяльны мір. Толькі павага да права дае магчымасць быць сапраўды свабоднымі. Ён таксама сцвярджаў, што рэлігійная цярпімасць – аснова ўсякай цывілізаванай дзяржавы, а рэлігійны выбар – неад'емнае права чалавека ў грамадстве.

Такім чынам, А. Валовіч і Л. Сапега ўнеслі значны ўклад ва ўмацаванне дзяржаўнага ладу і самастойнасці Вялікага Княства Літоўскага, у развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі. Іх ідэі, думкі і сёння застаюцца актуальнымі і запатрабаванымі сучаснай прававой навукай.

## РАЗВІЦЦЁ ІНСТЫТУТА АДВАКАТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ

***А. А. Міхнввін**, Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Судовы абаронца, або інакш памочнік – абавязковы ўдзельнік любога сучаснага судовага працэсу. Першыя ж юрысты, у тым ліку і адвакаты, з'явіліся яшчэ ў часы старажытнага Рыма. У Рымскай Імперыі юрыстамі станавіліся найбольш адукаваныя, паважаныя, таленавітыя людзі з добра пастаўленай мовай. Нягледзячы на гэты факт, у ВКЛ да пачатку XVI ст. інстытут адвакатуры не быў добра развіты і фактычна не існаваў. Яго развіццё непарыўна звязана з развіццём норм статутаў. Упершыню пра адвакатаў згадвалася ў арт. 10 Статута ВКЛ 1529 г. Аднак гэты артыкул не раскрываў усю важнасць гэтай пасады, парадак прызначэння гэтых асоб і інш. Адзначалася толькі тое, што гэтую пасаду мог займаць толькі землеўладальнік (інакш кажучы, шляхціч або аселы селянін) ВКЛ. Сутнасць жа гэтай прафесіі часткова была паказана толькі ў Статуце ВКЛ 1566 г. Пачынаючы з другога статута, адваката пачалі называць пракуратарам, функцыі жа яго засталіся практычна нязменнымі: абарона інтарэсаў аднаго з бакоў у судовай справе. Цікава апісвалюя яго абавязкі: пракуратар дапамагаў тым, хто «не умѢлъ самъ

мовити або речы Сваёй справовати» (арт. 33). Існавала і працэсуальнае раўнапраўе бакоў. У выпадку запрашэння адным з бакоў сабе адваката, другому боку пракуратар даваўся дзяржавай. У Статуце ВКЛ 1588 г. гэта палажэнне было ўдакладнена: бясплатныя пракуратар даваліоя так званым «жабракам», якімі лічыліся калекі, сіраты, удовы і інш. (арт. 57). Прызначэнне на гэтую пасаду і яго парадак былі ўпершыню ўрэгуляваны толькі ў апошнім Статуце. Норма была вельмі падобная на аналагічную норму сучаснага беларускага заканадаўства аб адвакатуры. Пракуратарам мог быць сумленны землеўладальнік, акрамя асоб, якія займалі пасады суддзяў, падсудкаў, пісараў і духоўных дзеячаў (арт. 58). Артыкулы 59, 60, 61 вызначаюць тэрмін службы пракуратара, забарону ажыццяўлення супрацьпраўных дзеянняў і пакаранне за іх учыненне. Парадак ажыццяўлення службовых паўнамоцтваў усімі судовымі службовымі асобамі быў падрабязна ўрэгуляваны, не выключэннем былі і пракуратары (прафесійныя адвакаты). Яны не мелі права прызначаць замест сябе чалавека, які б мог выконваць іх паўнамоцтвы ў судзе. Іх прысутнасць пры разглядзе справы была абавязковай (арт. 59). Пры адмове ад прынясення прысягі пракуратар «караўся горлам». Пры прычыненні зацікаўленаму боку матэрыяльнай шкоды, пракуратар павінен быў матэрыяльна кампенсаваць прычыненую шкоду, яшчэ больш ён пазбаўляўся права займацца прафесійнай дзейнасцю на 4 тыдні. Свайго прыватнага адваката, як і цяпер у замежных краінах, мелі ўсе акрамя суддзяў, падсудкаў, пісараў, духоўных асоб і, зразумела, «беднага народа» (арт. 34 Статута ВКЛ 1566 г.).

Пракуратар павінен быў ажыццяўляць сваю дзейнасць у адпаведнасці з няпісаным кодэксам гонару адваката. Пры парушэнні яго палажэнняў (напрыклад, перадача матэрыялаў справы супрацьлегламу боку) адвакат-шляхціц губляў свой тытул, а нешляхціч – жыццё. Пасля гэтага пацярпелы бок мог пачаць абараняць сябе самастойна або знайсці іншага пракуратара (арт. 35). Пры нечаканай хваробе пракуратара ён не нёс ніякай адказнасці за сваю адсутнасць, аднак па сканчэнні трох судовых тэрмінаў ён вымушаны быў прадставіць пісьмовыя тлумачэнні свайго ўчынку. Пасля выздараўлення ад хваробы пракуратар павінны быў апавясціць пра гэта вышэйшыя органы дзяржаўнага кіравання. Пракуратар падпадаў пад смяротнае пакаранне ў выпадку здрады свайму кліенту і прадастаўленні матэрыялаў справы супрацьлегламу боку (арт. 36). Хоць пракуратары і не адыгрывалі такой вялікай ролі, як суддзі, возныя, аднак менавіта яны маглі змяніць ход разгляду справы. Пракуратары фактычна з'яўляліоя не толькі абаронцамі, але і памочнікамі ў ажыццяўленні законнасці. На жаль, у савецкі час беларуская адвакацкая спадчына была амаль канчаткова забыта, і аднаўленне інстытута адвакатуры праводзілася па расійскім узоры.